ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1983

29

КАСТРЫЧНІКА
СУБОТА

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

28

№28

"Беларускі універсітэт"

Мэлетаўп

• Учора • Сёння • Заўтра •

У КАМСАМОЛЬСКІХ АРГАНІЗАЦЫЯХ

факультэтаў пачаліся справаздачна-выбарныя канферэнцыі. Яны праходзяць на высокім ідэйна-арганізацыйным узроўні.

В. ЮР'ЕЎ.

ПЕРШАЕ МЕСЦА

На чэмпіянаце Цэнтральнага Савета ДСТ «Буравеснік» па класічнай барацьбе ў вагавай катэгорыі да 62 кг заняў студэнт першага курса юрыдычнага факультэта Камандар Маджыдаў.

В. РУДЗЯНКОЎ.

ПРАЦЯГВАЕЦЦА МЕСЯЧНІК

па прапагандзе і распаўсюджанню грамадска-палітычнай літаратуры, прысвечаны 66-й гадавіне Вялікага Кастрычніка. Ён праводзіцца Цэнтральным кніжным магазінам. Жадаючыя маюць магчымасць набыць літаратуру па гісторыі Беларускай ССР, гістарычнаму матэрыялізму, асновах навуковага атэізму, якая можа быць выкарыстана як для пашырэння агульнага кругагляду, так і пры падрыхтоўцы да практычных і семінарскіх заняткаў.

Л. РАЗАНЦАВА.

СТУДЭНЦКІ КЛУБ

запрашае жадаючых у калектывы мастацкай самадзейнасці: народны ансамбль танца «Крыжачок», тэатр пантамімы, народны аркестр народных інструментаў, студэнцкі тэатр мініяцюр, народны студэнцкі тэатр, духавы аркестр, вакальна-інструментальны ансамбль, народную харавую капэлу, фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Неруш», народную агітбрыгаду.

У. МАКАРЭВІЧ.

БЮРО КАМІТЭТА КАМСАМОЛА

на чарговым пасяджэнні разгледзела выкананне камітэтамі камсамола факультэтаў пастановы бюро «Аб правядзенні справаздач і выбараў у камсамольскай арганізацыі універсітэта». У ходзе абмеркавання адзначана цікавая форма правядзення справаздачна-выбарнага сходу ў 4 групе 2 курса ФПМ. Разам з тым указана на недастаткова высокі узровень правядзення справаздач і выбараў на фізічным, механіка-матэматычным, філалагічным факультэтах, факультэце прыкладной матэматыкі. Сакратару камітэта камсамола фізфака А. Каранько аб'яўлена строгая вымова, сакратару камітэта камсамола мехмата А. Ліпа — вымова.

Ю. ВАРАТНІЦКІ.

САРДЭЧНА ВІТАЕМ ДЭЛЕГАТАЎ III СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНАЙ ПАРТЫЙНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ УНІВЕРСІТЭТА!

КАМУНІСТЫ! БУДЗЬЦЕ Ў АВАНГАРДЗЕ ЎСЕНАРОДНАЙ БАРАЦЬБЫ ЗА ВЫКАНАННЕ ГІСТАРЫЧНЫХ РАШЭННЯЎ XXVI З'ЕЗДА ПАРТЫІ, ЛІСТАПАДАЎСКАГА І ЧЭРВЕНЬСКАГА ПЛЕНУМАЎ ЦК КПСС!

(З Заклікаў ЦК КПСС).

Пярвічная партарганізацыя — палітычнае ядро працоўнага калектыву. Ад яе мэтанакіраванай работы залежыць усё. Толькі ўдасканальваючы стыль і метады сваёй дзейнасці, дабіваючыся высокага ўзроўню арганізацыйна-партыйнай работы, большай эфектыўнасці партыйнага кіраўніцтва жыццём факультэта, партыйная арганізацыя можа на справе, а не на словах іграць важную ролю ў калектыве.

СЛОВА — САКРАТАРУ ПАРТБЮРО

КІРАВАЦЬ — ЗНАЧЫЦЬ ПРАДБАЧЫЦЬ

Гэта добра разумее партбюро ФПМ, таму пры планаванні сваёй работы, пытанняў партыйных сходаў і пасяджэнняў партбюро асноўная ўвага канцэнтруецца на галоўных пытаннях жыцця факультэта: удасканаленні вучэбнага працэсу, паляпшэнні эфектыўнасці НДР, работы камсамольскай арганізацыі, камуністычнага выхавання студэнтаў...

Важнейшая састаўная частка аргпартработы — кантроль і праверка выканання. Партыйнае бюро настойліва ўдасканальвае тэхналогію кантролю, інфармацыі камуністаў аб ходзе выканання рашэнняў і рэалізацыі крытычных заўваг і прапаноў. Стыль работы партыйнага бюро характарызуюць пастаноўка і зняцце з кантролю прынятых пастаноў, рэгламентацыя пасяджэнняў партбюро, памяншэнне колькасці пытанняў, якія выносяцца на абмеркаванне, і, як вынік, больш глыбокая іх прапрацоўка, канкрэтны характар пастаноў, своечасовае давядзенне іх да выканаўцаў.

Важнае значэнне мы надаём падрыхтоўцы партыйных сходаў. Загадзя ствараецца камісія, якая аналізуе стан спраў па таму ці іншаму пытанню, забяспечваючы тым самым актыўны ўдзел камуністаў у абмеркаванні.

У стылі і метадах работы партбюро факультэта ёсць шмат нявыкарыстаных рэзерваў па ўдасканаленню работы. Неабходна палепшыць канкрэтнасць і дзелавітасць пастаноў, падняць на якасна новы ўзровень індывідуальную работу з камуністамі.

Разам з тым і парткому універсітэта патрэбна ўдасканальваць стыль кіраўніцтва, больш патрабавальна і глыбока аналізаваць дзейнасць нізавых партыйных звенняў, канкрэтна вызначаць іх асноўныя задачы. Сакратары партбюро факультэтаў чакаюць больш дзейснай дапамогі з боку парткома і ў пытаннях канкрэтнага планавання работы сектараў партбюро (сувязь сектараў і аддзелаў парткома з адпаведнымі сектарамі партбюро факультэтаў была недастатковай), і па канкрэтных пытаннях дзейнасці партгруп кафедр, студэнцкіх партгруп. Недастатковым было інфармаванне камуністаў, партыйных арганізацый аб рабоце парткома па выкананню крытычных заўваг і прапаноў, выказаных камуністамі на нарадах партактыву. Неабходна палепшыць кіраўніцтва з боку парткома работай грамадскіх арганізацый.

Удасканаленне арганізацыйна-партыйнай работы — важнейшае пытанне для кожнай партарганізацыі. Памятаць пра гэта, нястомна дабівацца, каб ленінскія нормы сталі цвёрдым правілам у рабоце — прамы абавязак кожнай партарганізацыі, кожнага камуніста.

М. ФЕДЗЯНЯ,
сакратар партбюро ФПМ.

НА ЗДЫМКУ: дэлегаты універсітэцкай партыйнай канферэнцыі ад ФПМ на пасяджэнні партбюро.

Фота **С. Плыткевіча.**

ШТРЫХІ ДА ПАРТРЭТА ДЭЛЕГАТА

БЫЦЬ ПРЫКЛАДАМ

ПЕРШАЕ, што здзіўляе, калі назіраеш за гэтым чалавекам — яго паходка. Міхаіл Іванавіч Юзефовіч, нягледзячы на салідны ўзрост, ходзіць лёгка і хутка. Так жа размаўляе. Энергічна. Захоплена. Шчыра. Так жа працуе. Па-маладому. Аддана і адказна. Ён загадчык вучэбна-вытворчых майстэрань. Вось ужо 22 гады працуе без заўваг і нараканняў. Калектыў падабраў сабе адпаведны — дысцыплінаваны, адказны, дружны.

А мінулае Міхаіла Іванавіча звязана з небам. Грозным. Ваенным. І мірным, але поўным непрадбачаных складанасцей. Лётчык. Гэтым тлумачыцца многае. І тое, што ні разу на «грамадзянскай» пасадзе не дазволіў сабе спазніцца на працу. І тое, што праскакваюць у яго гаворцы ваенныя тэрміны. І тое, што як і тады, калі быў інструктарам у ваенна-авіяцыйным вучылішчы, не можа ён крыкам дабівацца рэзультата. Лепш сто разоў растлумачыць. Спакойна. Цярпліва. Пакуль не адчуе — задачу зразумелі. Ён усё так робіць. І ніколі ўпэўненасць ва ўласных сілах яго не падводзіла, таму што вельмі добра ведае Міхаіл Іванавіч сэнс слова «трэба».

Трэба — разам з адзінаццацю братамі і сёстрамі (сем'і ў той час былі вялікія) траву еў, каб выжыць.

Трэба — партыя паклікала: «Камсамол, на самалёт!» — стаў першакласным лётчыкам.

Трэба — без адпачынку рыхтаваў лётныя кадры. Сярод яго выхаванцаў лётчыкі-касманаўты СССР Гарбатко, Камароў.

Трэба — маленькую майстэрню універсітэта з адным станком ператварыў, як цяпер жартуюць, у цэлы завод.

Рабіў і робіць усё з перавышэннем, па самаму вялікаму рахунку. Як грамадзянін, працаўнік, камуніст Міхаіл Іванавіч упэўнены: галоўнае — асабісты прыклад. Можа, іменна таму ён мае права лічыць сябе шчаслівым: «іду дамоў — думаю пра заўтрашні дзень».

Як гэта цудоўна — з надзеяй і радасцю сустракаць заўтра.

В. СКРАМІНСКАЯ,
студэнтка факультэта журналістыкі.

ЖЫЦЬ ПЕРСПЕКТЫВАЙ

ГЕРОЙ САВЕЦКАГА Саюза прафесар Дзмітрый Пятровіч Жмуроўскі з пачуццём асаблівай адказнасці рыхтуецца да гэтых лекцый. Размова аб Вялікай Айчыннай вайне — гэта не толькі факты, лічбы і пералічэнне франтоў. Як хочацца Дзмітрыю Пятровічу, каб яго студэнты гэта адчувалі! І ён расказвае. Пра тое, як яму, студэнту-трэцякурсніку Магілёўскага педінстытута, было цяжка і жахліва ў першых баях, як ён з некалькімі байцамі пяць з паловай сутак быў адарваны ад сваёй часці, але ўтрымаўся на плацдарме. (За гэта Дзмітрыю Пятровічу было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза). Пра тое, як гэта цудоўна і высакародна — быць вызваліцелем.

У баях гартаваўся характар, выспявала тое асноўнае, што называюць сэнсам жыцця...

Мэтанакіраванасць. Упэўненасць у сабе і таварышах. Для Дзмітрыя Пятровіча гэта не проста словы, у іх — перажытое, асэнсаванае. У іх — мінулае і сённяшняе. Мінулае, калі, гледзячы смерці ў вочы, памятаеш: галоўнае вучыцца, хай толькі скончыцца гэта праклятая вайна. Сённяшняе — калі не стамляешся жыць перспектывай. Так, як жыве і працуе камуніст і настаўнік Дзмітрый Пятровіч Жмуроўскі.

Н. АЛЕГАВА.
наш кар.

Асаблівасць нашага часу ў тым, што пад удар інфармацыйнага выбуху трапіла ў першую чаргу вышэйшая школа: як прафесура, так і студэнты. Агульны аб'ём гадзін, якія адводзяцца па вучэбнаму плану на спецыялізацыю, ды і на базавую падрыхтоўку, паменшыўся. Аб'ём жа інфармацыі, неабходны студэнту як абавязковы, узрос па меншай меры ў паўтары-два разы. Так утварыўся разрыў паміж неабходнасцю павелічэння колькасці лекцый, практычных і лабараторных заняткаў і немагчымасцю змяніць колькасць гадзін, якія адводзяцца па вучэбнаму плану. Значыць, пошукі шляхоў пераадолення гэтай супярэчнасці павінны быць дастаткова шырокімі: гэта аналіз, з мэтай удасканалення, вучэбных праграм; прымяненне тэхнічных сродкаў навучання, удасканаленне майстэрства выкладчыкаў і г. д.

● СЛОВА — ДЭКАНУ

Агонь запальваецца ад агню

Коратка спынюся на ўдасканаленні вучэбных праграм і вызначэнні мэтавай функцыі. Уключэнне таго ці іншага раздзела ў праграму часам не прадыктавана неабходнасцю будучай спецыяльнасці выпускніка, яго прафесійнай дзейнасцю, а вызначаецца суб'ектыўным падыходам складальнікаў праграм, якія змагаюцца за гэты непатрэбны раздзел ці ў сілу традыцыі, ці ў сілу «асабістага вопыту» як правіла вельмі сталых складальнікаў. Яшчэ больш складаным з'яўляецца пытанне аб паўтарэнні, часам шматразовым, адных і тых жа раздзелаў у розных курсах. Вызначэнне мэты заняткаў: «ведаць», «умець» ці «мець уяўленне» ў многіх курсах праводзіцца не лепшым чынам. Гэта вынікае хаця б з таго, што ў новым вучэбным плане лабараторныя работы падмянілі практычнымі заняткамі. Мэты навучання ў гэтых двух відах заняткаў настолькі розныя, што практычна будучы спецыяліст становіцца ці чыстым тэарэтыкам, ці, хоць умоўна, эксперыментатарам. Навучанне майстэрству эксперымента — гэта адна з важнейшых задач сённяшняга дня. І, відаць, ад рашэння яе мы адмаўляемся.

Выкарыстанне тэхнічных сродкаў навучання стала модай. Але за модай, калі практычная каштоўнасць яе ўсвядомлена, хаваецца вострая патрэба. Вастрыня гэтая звязана з шырокім укараненнем ва ўсе сферы чалавечай дзейнасці розных прылад і дапаможных прыстасаванняў, аргтэхнікі і тэхнікі атрымання інфармацыі, электронных вылічальных машын. Таму, гаворачы аб тэхнічных сродках навучання, мы маем на ўвазе дзве мэты: першая — выкарыстанне гэтых сродкаў дапаможа істотна павысіць, пры ўмелым выкарыстанні, эфектыўнасць расходавання вучэбнага часу; і другая — азнаямленне навучэнца з сучаснымі дапаможнымі прыстасаваннямі, прывіццё студэнту элементаў агульнай тэхнічнай культуры. Для выпускнікоў шэрагу прыродазнаўчых факультэтаў патрэбна лічыць неабходным уменне працаваць з электроннымі вылічальнымі машынамі. Зараз пачынаецца размова пра так званае «электроннае мысленне». Не гаворачы нічога аб трапнасці гэтага тэрміна, мы вымушаны пагадзіцца з тым, што любая даследчая работа будзе звязана з выкарыстаннем ЭВМ і з распрацоўкай для яе адпаведнай праграмы.

Гаворачы аб удасканаленні майстэрства выкладчыка, перш за ўсё патрэбна сказаць аб яго ролі і аўтарытэце. Выкладчык— прафесар, дацэнт, асістэнт — гэта цэнтральная фігура ВНУ, яго галоўная рабочая сіла, носьбіт ведаў і выхавацель, удумлівы агітатар і аб'ектыўны суддзя. Яшчэ раз падкрэсліваю — цэнтральная фігура ў ВНУ, распрацоўшчык, тэхнолаг і стваральнік вучэбнага працэсу. Поспехі любой школы вызначаюцца саставам выкладчыкаў, «лектараў», як пісаў У. І. Ленін.

Выхаванне грамадзяніна — гэта вельмі важны элемент работы выкладчыка, але не адзіны. Выхаванне працавітасці, дысцыплінаванасці, адказнасці за даручаную справу, інтэлігентнасці, душэўнай шчодрасці і калектывізму, барацьба з індывідуалізмам і лянотаю — усё гэта вялікая работа кожнага выкладчыка, якая не адзначаецца ў індыв'дуальным плане і патрабуе ад яго і сур'ёзнай работы і пастаяннага кантролю за сабой. Палітычнае выхаванне, звязанае перш за ўсё з ідэалагічнай работай выкладчыкаў усіх спецыяльнасцей, павінна стаць важнейшай часткай іх дзейнасці. Таму сярод усёй сукупнасці патрабаванняў, якія прад'яўляюцца да выкладчыка ВНУ, першае — гэта яго палітычная сталасць.

З вучэбнай, прафесійнай у аснове сваёй функцыі, выцякае другое патрабаванне да выкладчыка — высокія прафесійныя веды. Гавораць, ёсць два тыпы выкладчыкаў: «ведаюць, што гавораць», другія «гавораць, што ведаюць». Вядома, што ўсякі пачынаючы выкладчык на першым часе прахо-дзіць праз гэту цяжкую для яго ступень, калі ён «гаворыць, што ведае». Ён баіцца, што яго ведаў не хопіць, што ён не адкажа на пытанні сваіх слухачоў. Калі з'яўляюцца прафесійныя веды, страх знікае. З'яўляецца хваляванне. Яно натуральна, і мала хто з выкладчыкаў можа сказаць, што ён не хвалюецца перад сустрэчай са сваімі слухачамі. Аднак прафесійныя веды — з'ява праходзячая. Для таго, каб яны заўсёды былі на належным узроўні, іх патрэбна ўвесь час аднаўляць. Аўтарытэт выкладчыка ў значнай меры абапіраецца іменна на прафесійныя веды. У гэтым плане можна назваць шэраг выкладчыкаў факультэта: дацэнтаў М. М. Паснова, А. А. Лабуду і В. І. Кузьміча.

Не ў малой ступені адбіваецца на навучанні і такая якасць выкладчыка, як метадычнае майстэрства. Майстар — гэта спецыяліст, які дасягнуў высокага майстэрства ў тлумачэнні незразумелага, у пошуках простых і даступных разуменню аналагаў. Я б сказаў, што тут выкладанне падобна на паэзію, у якой знаходка ўдалага параўнання заўсёды лічылася майстэрствам.

Чацвёртае патрабаванне — гэта артыстызм выкладчыка. Мала ведаць і ўмець выкладаць — патрэбна яшчэ і зацікавіць. Артыстызм асноўваецца на пачуцці цудоўнага, на тонкім і далікатным разуменні прыгажосці формы, зместу, думкі і паводзін. Пачуццё прыгожага развіта ў людзей у рознай ступені. І ўсё ж выкладчык павінен умець прымусіць шчыра радавацца ўсякай прыгажосці, якая ствараецца ў працэсе заняткаў.

Пятае патрабаванне — гэта патрабаванне дастаткова шырокай агульнай эрудыцыі выкладчыка. Асноўным зместам цікавага чалавека з'яўляецца яго ўменне быць дастаткова кампетэнтным у розных галінах ведаў і асабліва ў галіне мовы, літаратуры, гісторыі і асаблівасцей НТР.

Аўтарытэт выкладчыка ў значнай меры залежыць ад яго аб'ектыўнасці. Нішто так не садзейнічае страце аўтарытэту выкладчыка як неаб'ектыўнасць ва ўзаемаадносінах з вучнямі. Перш за ўсё ўстанавіць паміж сабой і слухачамі знак роўнасці — гэта неабходнасць. А ў час ацэнкі ведаў паміж выкладчыкам і слухачом устанаўліваюцца ўзаемаадносіны: аб'ект — эксперт. І вось тут, выступаючы як эксперт, выкладчык не павінен даваць волю сімпатыям. Завышэнне адзнакі—шкодна, заніжэнне — яшчэ ў большай ступені. Патрэбна паважаць таго, каго вучыш.

Але самай вялікай павагі дастойны выкладчык.

А. ШЫРОКАЎ,
дэкан факультэта радыёфізікі і электронікі, прафесар.

● СЛОВА — ЧЛЕНУ БЮРО ПАРТКОМА

СТРАТЭГІЯ ПАТРАБАВАЛЬНАСЦІ



У рабоце партыйнай камісіі пры парткоме асноўная стаўка рабілася на кантроль за выкананнем камуністамі патрабаванняў Статута КПСС, лістападаўскага (1982 г.) і чэрвеньскага (1983 г.) Пленумаў ЦК КПСС.

Зыходзячы з гэтага, партыйная камісія пастаянна трымала ў полі зроку пытанні, звязаныя са станам партыйнай і працоўнай дысцыпліны. У ходзе работы былі заслуханы і абмеркаваны пытанні аб стане партыйнай дысцыпліны ў камуністаў філалагічнага і юрыдычнага факультэтаў, аб рабоце з маладымі камуністамі на гістарычным факультэце. Акрамя таго, за справаздачны перыяд камісія разгледзела больш за 30 персанальных спраў камуністаў, якія парушалі нормы партыйнага жыцця. За гэты час 6 членаў партыі выключаны з членаў КПСС, 4 — прыцягнуты да партыйнай адказнасці за страту партыйных дакументаў, 3 камуністы пакараны за злоўжыванне спіртнога. Так, адзін з іх, інжынер НДІ ПФП С. Д. Ціхамірaў, будучы ў нецвярозым стане, выязджаў на лінію на аўтамашыне і быў затрыманы органамі ДАІ і прыцягнуты да крымінальнай адказнасці. Аднак, партарганізацыя НДІ ПФП беспрынцыпова падышла да ацэнкі паводзін камуніста, пакінуўшы яго ў радах партыі.

За сістэматычныя п'янкі прыцягваўся да партыйнай адказнасці выкладчык кафедры рускай мовы філалагічнага факультэта М. Н. Дарашэнка. На жаль, сярод парушальнікаў партыйнай дысцыпліны ёсць і кіраўнікі некаторых падраздзяленняў.

У цэнтры ўвагі партыйнай камісіі былі таксама пытанні, звязаныя з маральным абліччам камуністаў. Тры члены КПСС, якія дапусцілі парушэнні норм камуністычнай маралі, атрымалі партыйныя спагнанні.

Парткамісіяй праведзены шэраг праверак на фізічным факультэце, у спартыўна-аздараўленчым лагеры «Нарач». Найбольш актыўны ўдзел у рабоце парткамісіі прымалі камуністы Я. Л. Прыбыткова, А. А. Шынгель, В. В. Гермянчук, А. Е .Сімакоў і іншыя.

Падводзячы вынікі работы, патрэбна адзначыць, што парткамісія не заўсёды своечасова рэагавала на парушэнні камуністамі Статута КПСС і працоўнай дысцыпліны. Гэтае ўпушчэнне неабходна выправіць у далейшай рабоце.

М. ЗАЙЦАЎ,
старшыня парткамісіі пры парткоме.

НА ЗДЫМКУ: дэлегат партыйнай канферэнцыі Герой Савецкага Саюза Мікалай Якаўлевіч Зайцаў чытае лекцыю для студэнта-юрыстаў па марксістска-ленінскай філасофіі.

Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

● СЛОВА — ЧЛЕНУ ПАРТКОМА

ГАРТУЙСЯ У СПРАВАХ, ЗМЕНА

У партыйнай арганізацыі універсітэта — 372 маладыя камуністы. З іх 42 — кандыдаты ў члены КПСС. Усё большая ўвага ў партыйнай арганізацыі ўдзяляецца палітычнай і ідэйнай загартоўцы папаўнення. «Мы павінны імкнуцца падняць званне і значэнне члена партыі вышэй, вышэй і вышэй...» — падкрэсліваў У. І. Ленін. Гэты ленінскі запавет вельмі актуальны і сёння.

Важнай формай работы партарганізацыі універсітэта па выхаванню маладых членаў КПСС з'яўляецца іх вучоба ў школах маладога камуніста. Асноўнай задачай такіх школ з'яўляецца паглыбленае вывучэнне Статута і Праграмы партыі. У бягучым навучальным годзе ва універсітэце працуе 10 школ маладога камуніста.

Да кіраўніцтва заняткамі ў школах прыцягваюцца найбольш вопытныя камуністы, якія карыстаюцца павагай у калектыве. Шмат энергіі выхаванню маладога папаўнення аддаюць асістэнт Я. М. Асінкова, дацэнты З. Р. Грыгор'ева, Г. А. Калініна.

Патрэбна заўважыць, што ў рабоце школ маладога камуніста яшчэ шмат недахопаў. У шэрагу выпадкаў парушаецца перыядычнасць заняткаў. Заняткі ў школах на гістарычным,, юрыдычным факультэтах нярэдка праводзяцца толькі раз у месяц, жадае быць лепшым наведванне.

Галоўным сродкам ідэйнага выхавання маладых камуністаў з'яўляецца вучоба іх на лепшых узорах — вучоба ў паўсядзённай практычай рабоце. У практыку работы пярвічных партыйных арганізацый шырока ўвайшлі перыядычныя справаздачы маладых камуністаў аб выкананні сваіх абавязкаў. У ходзе такой справаздачы выяўляюцца і адносіны да вытворчай, партыйнай і грамадскай работы, адносіны да таварышаў, маральныя якасці кожнага камуніста.

Дзейснай формай работы з маладымі камуністамі на механіка-матэматычным факультэце, факультэце прыкладной матэматыкі, гістарычным з'яўляюцца індывідуальныя гутаркі. Яны даюць магчымасць не толькі лепш пазнаць характар чалавека, высветліць цяжкасці, што перашкаджаюць раскрыцца яму як актывісту, але часта і выслухаць прапановы, з якімі камуніст не рашыўся выступіць публічна.

Партыйны камітэт два разы разглядаў пытанне аб рабоце з маладымі камуністамі на гістарычным факультэце. Пры партыйным камітэце былі арганізаваны вучоба кіраўнікоў школ маладога камуніста, выстаўкі літаратуры. Шмат увагі ўдзялялася індывідуальнай рабоце адказных за работу з маладымі камуністамі на факультэтах, складанню планаў работы партарганізацыяй з маладымі камуністамі. Тут дарэчы адзначыць невысокую выканаўчую дысцыпліну, у выніку чаго эфектыўнасць некаторых мерапрыемстваў недастатковая.

Найбольш яскравым пацверджаннем гэтаму з'яўляецца наступны прыклад. Авангардная роля камуніста-студэнта праяўляецца перш за ўсё ў яго адносінах да вучобы. А якім прыкладам могуць быць маладыя камуністы — студэнты гістарычнага факультэта, 12 працэнтаў якіх у летнюю экзаменацыйную сесію атрымалі нездавальняючыя адзнакі?

Найбольш істотную ролю ў павышэнні адказнасці камуністаў за сваю паспяховасць павінны адыграць партыйныя групы. Партыйныя бюро факультэтаў і партком універсітэта павінны, у сваю чаргу, павысіць патрабавальнасць да маладых камуністаў за выкананне імі ўсіх палажэнняў Статута КПСС.

Л. ЗАЛАТАРЭВІЧ,
намеснік дырэктара ВЦ.

● НТЭРВ'Ю З ДЭЛЕГАТАМ

«Мы на правільным шляху»

НАПЯРЭДАДНІ III ПАРТЫЙНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ НАШ КАРЭСПАНДЭНТ Н. КАЛІШЭВІЧ РАЗМАЎЛЯЕ З ДЭЛЕГАТАМ, ДЭКАНАМ ФАКУЛЬТЭТА ЖУРНАЛІСТЫКІ, ПРАФЕСАРАМ П. І. ТКАЧОВЫМ.

— Павел Іванавіч, з часу мінулай партканферэнцыі прайшло ўжо 2 гады. На што накіроўвалі камуністы журфака сваю ўвагу!

— Сваёй задачай мы ставім планамерную, мэтанакіраваную падрыхтоўку маладых спецыялістаў. Выхоўваем іх на багатых традыцыях факультэта, саракагоддзе якога, дарэчы, будзем святкаваць у наступным годзе. За гэты час больш як тры тысячы студэнтаў атрымалі дыпломы журналістаў. Каля 98 працэнтаў работнікаў друку рэспублікі— нашы выпускнікі. Гэтым можна ганарыцца. І на гэта арыентавацца ў далейшым, таму што наш абавязак — падрыхтаваць не проста спецыяліста з пэўнай колькасцю ведаў, але і выхаваць сталага журналіста, таго, хто ў будучым стане фарміраваць грамадскую думку. Заўсёды памятаць аб гэтай спецыфічнай рысе факультэта — вось на што трэба звяртаць увагу ў паўсядзённай працы.

— Зусім нядаўна факультэт пераехаў на новае «места жыхарства», а тут, на Маскоўскай, 15, засталося аддзяленне міжнароднай журналістыкі. Калі ласка, некалькі слоў аб яго задачах, праблемах і перспектывах.

— Тут мы таксама маем магчымасць гаварыць пра юбілей. Няхай маленькі, але для нас вельмі значны. Вось ужо пяць гадоў працуе на факультэце аддзяленне міжнароднай журналістыкі. Мы рыхтуем спецыялістаў для друку, радыё і тэлебачання з ліку замежных грамадзян. Справа гэта новая і няпростая, але ёсць ужо і некаторыя вынікі: у мінулым навучальным годзе адбыўся першы выпуск. Пятнаццаць прадстаўнікоў краін, якія развіваюцца, атрымалі дыпломы магістраў журналістыкі, дванаццаць — маюць права выкладаць рускую мову як замежную.

— Што Вы лічыце самым важным у справе падрыхтоўкі спецыялістаў для замежных краін!

— Студэнт павінен паехаць ад нас сябрам нашай краіны. Гэта асноўнае. І прафесіяналам. Гэта таксама важна.

— І як адбываецца яго станаўленне ў якасці прафесіянала!

— Безумоўна, пры актыўнай дапамозе вопытных выкладчыкаў. Акрамя вучобы, мы арганізуем навукова-даследчую работу студэнтаў, стварылі спецыяльныя гурткі, заахвочваем выступленні замежных навучэнцаў у перыядычным друку.

— І паспяхова!

— А як жа! Напрыклад, Гарсіс Раберта Антоніа з Сальвадора ўдзельнічаў у конкурсе «Залатое пяро» і атрымаў прэмію Саюза журналістаў БССР за матэрыял «Пра мір, пра шчасце хачу гаварыць», надрукаваны ў газеце «Советская Белоруссия». А Рабін Ман Шак'я з Непала — член Асацыяцыі непала-савецкай дружбы і арганізатар Таварыства рускай мовы — у 1980 годзе на радзіме выдаў брашуру «Значэнне вывучэння рускай мовы». У цяперашні час ён рыхтуе да друку кнігу аб БССР.

Мяркую, гэтыя прыклады сведчаць, што мы на правільным шляху.

● СЛОВА — СТАРШЫНІ САВЕТА ВЕТЭРАНАЎ

ПАМНАЖАЦЬ ТРАДЫЦЫІ

У ліку актуальных пытанняў ідэалагічнай, масава-палітычнай работы партыі ў сучасных умовах чэрвеньскі (1983 г.) Пленум ЦК КПСС паставіў задачу далейшага паляпшэння патрыятычнага выхавання савецкіх людзей. Пленум адзначыў неацэнную ролю ў гэтай справе ветэранаў рэвалюцыі, вайны і працы, падкрэсліў неабходнасць захоўваць і памнажаць традыцыі патрыятычнага выхавання.

Нядаўняя сустрэча ветэранаў партыі ў Цэнтральным Камітэце КПСС— яшчэ адно пацверджанне гэтаму.

Багаты слаўнымі баявымі традыяцыямі калектыў нашага універсітэта. У гады Вялікай Айчыннай вайны многія выкладчыкі і студэнты універсітэта мужна змагаліся на франтах Вялікай Айчыннай, а таксама ў саставе партызанскіх фарміраванняў, добрасумленна працавалі ў савецкім тыле.

Накоплены значныя працоўныя традыцыі ў пасляваенныя гады. Зусім нядаўна універсітэт адзначыў сваё шасцідзесяцігоддзе. За актыўны ўдзел у ваенна-патрыятычным выхаванні арганізацыя ветэранаў універсітэта, музей гісторыі ўзнагароджаны вышэйшымі узнагародамі Савецкага камітэта ветэранаў вайны— Ганаровымі вымпеламі і Памятнымі медалямі.

Ветэраны — баявыя таварышы студэнцкай моладзі. Яны актыўна ўдзельнічаюць у ваенна-патрыятычных мерапрыемствах у школах, ГПТВ, на прадпрыемствах Мінска і рэспублікі. Выступаюць з гутаркамі, успамінамі, дакладамі, лекцыямі. Многія ветэраны — пастаянныя госці юнакоў і дзяўчат на ўроках мужнасці. Усе свае сілы аддаюць справе выхавання падрастаючага пакалення сапраўднымі патрыётамі камуністы—ветэраны КПСС Я. Ф. Плюта, Ф. Ф. Церашонак і іншыя. Актыўны ўдзел у рабоце з моладдзю прымаюць Героі Савецкага Саюза Д. П. Жмуроўскі і М. Я. Зайцаў, кавалеры многіх баявых ордэнаў А. С. Мізрахі, А. Ф. Палікарпаў, старшыні секцый ветэранаў вайны Л. Л. Кароткая, Я. А. Піскуноў, П. М. Хмялеўскі, Б. А. Сяргунін, а таксама Р. М. Трухноў, У. В. Лютаў, М. М. Шарый, М. К. Мазурэнка. Шмат ініцыятывы, энергіі ўкладваюць у даручаную справу члены савета ветэранаў вайны універсітэта А. М. Шырокаў, М. В. Гарлатаў, А. М. Рукшын.

Відавочна і дапамога ветэранаў вайны камітэтам камсамола па правядзенню Усесаюзнага паходу па месцах баявой і працоўнай славы савецкага народа. Разам з моладдзю яны ўдзельнічаюць і ў арганізацыі многіх іншых ваенна-патрыятычных мерапрыемстваў у перыяд правядзення працоўных семестраў, вядуць разам з камсамольцамі сумесны пошук герояў, якія загінулі ў гады вайны.

Выхоўваючы ў моладзі пачуццё павагі да памяці загінуўшых, да подзвігаў старэйшых пакаленняў, партыйныя, камсамольскія, прафсаюзныя арганізацыі ў сваю чаргу павінны яшчэ больш клапаціцца аб ветэранах, карыстацца любым выпадкам, каб выказаць ім удзячнасць за тую вялікую грамадскую работу, якую яны выконваюць. Увага да ветэранаў з'яўляецца важным стымулам на шляху ўзмацнення патрыятычнага выхавання моладзі.

І. МАРЧАНКА,
дацэнт кафедры гісторыі БССР.

● СЛОВА — КІРАЎНІКУ МЕТАДАЛАГІЧНАГА СЕМІНАРА

СВЕТАПОГЛЯДНАЯ ПАЗІЦЫЯ КОЖНАГА

У мінулым навучальным годзе ў Інстытуце фізіка-хімічных праблем і на хімічным факультэце універсітэта было арганізавана два семінары па метадалагічных пытаннях хіміі.

Мэту такіх семінараў добра сфармуліраваў віцэ-прэзідэнт АН СССР Ю. А. Аўчыннікаў, хімік па спецыяльнасці, старшыня Цэнтральнага Савета філасофскіх (метадалагічных) семінараў пры Прэзідыуме АН СССР: «Філасофскія (метадалагічныя) семінары з'яўляюцца важнейшай формай злучэння ідэйна-выхаваўчага працэсу з навукова-даследчай работай навуковых і выкладчыцкіх кадраў вышэйшай кваліфікацыі, закліканай садзейнічаць умацаванню і развіццю саюза дыялектыка-матэрыялістычнай філасофіі і спецыяльных навук, актыўна садзейнічаць сістэматычнаму паглыбленню марксісцка-ленінскага светапогляду навуковых і педагагічных кадраў».

У літаратуры па метадалагічных пытаннях хіміі ўдзяляецца значна менш увагі, чым, напрыклад, фізіцы і біялогіі, таму сваёй мэтай мы ставілі не толькі разгледжанне пытанняў, якія добра асветлены ў літаратуры, але і тых, якім у літаратуры па філасофіі адводзіцца мала месца.

Коратка раскажу аб тэматыцы аднаго з семінараў, за работу якога партыйнае бюро даручыла адказваць мне. Кіраўніком другога семінара быў загадчык кафедры фізічнай хіміі прафесар А. А. Вечар. Асноўнай тэмай семінара з'явілася зусім не распрацаванае ў літаратуры пытанне аб спрошчаных мадэлях, якія выкарыстоўваюцца ў хіміі і аб тлумачальных, прадказальных магчымасцях яе тэарэтычнага апарата. Паралельна на семінары абмяркоўваліся і бягучыя, надзённыя пытанні, што датычаць зместу важнейшых партыйных рашэнняў. Зразумела, што разгледжанне гэтых праблем па тэматыцы семінараў вядзецца на аснове законаў марксісцка-ленінскай філасофіі. У гэтым вялікую дапамогу нам аказваюць супрацоўнікі кафедры філасофіі, якія курыруюць семінар. Многа ўвагі ўдзяляецца на семінары крытыцы пазітывісцкіх, неапазітывісцкіх і постпазітывісцкіх трактовак сутнасці і ролі тэарэтычнага апарата навукі, сутнасці тлумачальных функцый навукі.

Нягледзячы на адсутнасць вопыту ў кіраўніцтве работай такога тыпу семінараў і на пакуль яшчэ недастатковую агульнафіласофскую падрыхтоўку яго ўдзельнікаў, на семінары ўжо ў першы год былі зроблены рэальныя крокі ў вырашэнні шэрагу не разгледжаных у літаратуры пытанняў.

У гэтым навучальным годзе колькасць семінараў па метадалагічных пытаннях хіміі падвоілася. Новымі семінарамі кіруюць загадчык лабараторыі інстытута дацэнт А. І. Лесніковіч і навуковы супрацоўнік інстытута А. І. Кумачоў.

Мы спадзяёмся, што да канца пяцігодкі вынікі семінараў будуць больш значнымі, і на іх аснове можна будзе падрыхтаваць некалькі публікацый па метадалагічных пытаннях хіміі, арыентаваных галоўным чынам на выкладчыкаў хімічных дысцыплін. У 1984 годзе некаторыя цікавыя для выракала кола выкладчыкаў хіміі метадалагічныя пытанні будуць разгледжаны на штогадовым семінары выкладчыкаў хімічных дысцыплін ВНУ.

В. СВІРЫДАЎ,
дырэктар НДІ ФХП, прафесар.

● СЛОВА — ПАРТГРУПОРГУ

МІКРАКЛІМАТ КАФЕДРЫ

Кафедра фізікі цвёрдага цела — адна з буйнейшых кафедр фізічнага факультэта. У яе саставе 36 супрацоўнікаў, у тым ліку адзін доктар тэхнічных навук (У. П. Гольцаў), 6 дацэнтаў. Тут праходзяць спецыялізацыю студэнты шасці акадэмічных груп вытворчага і педагагічнага патокаў дзённай формы навучання і трох груп вячэрнікаў, усяго каля 160 чалавек. Партыйная група кафедры налічвае 17 камуністаў, з іх 5 выкладчыкаў, 5 супрацоўнікаў і 7 студэнтаў.

Выконваючы рашэнні ліста-падаўскага (1982 г.) і чэрвеньскага (1983 г.) Пленумаў ЦК КПСС, камуністы кафедры цвёрдага цела праводзяць вялікую работу па ўмацаванню працоўнай і вучэбнай дысцыпліны, павышэнню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў-фізікаў. Гэтыя пытанні перыядычна разглядаюцца на сходах партгрупы. Так, на адным з апошніх, прысвечаным пытанням паспяховасці студэнтаў, што спецыялізуюцца на кафедры, было прынята рашэнне ўзмацніць кантроль за наведваннем заняткаў на вячэрнім аддзяленні.

У стварэнні здаровага мікраклімату ў калектыве важную ролю адыгрываюць усе бакі вучэбна-выхаваўчай, навуковай, выхаваўчай дзейнасці. Гэтаму дапамагае сацыялістычнае спаборніцтва, якое прафсаюзная арганізацыя сумесна з партыйнай групай выкарыстоўваюць для актывізацыі жыцця кафедры, мабілізацыі яе рэзерваў. І тут патрэбна сказаць добрыя словы ў адрас прафорга кафедры В. Р. Шапялевіча, які і словам і справай імкнецца падымаць значнасць сацыялістычнага спаборніцтва. У перыяд зацвярджання абавязацельстваў ён знаходзіць час для гутаркі з кожным супрацоўнікам. Часта пасля такіх гутарак знаходзяцца новыя рэзервы, якія дазваляюць прыняць больш напружаныя абавязацельствы. Ход спаборніцтва пастаянна адлюстроўваецца на спецыяльным стэндзе. Сумесныя сходы партыйнай і прафсаюзнай арганізацый, на якіх абмяркоўваецца ход выканання абавязацельстваў, праходзяць актыўна, па-дзелавому.

Партгрупа вялікую ўвагу ўдзяляе куратарскай рабоце. На сходах партыйнай групы рэгулярна заслухоўваюцца справаздачы куратараў аб вучэбнай дысцыпліне, бягучай паспяховасці студэнтаў, аб ходзе падрыхтоўкі і рэзультатах здачы экзаменацыйнай сесіі. Куратары кантралююць наведванне заняткаў, аператыўна высвятляюць прычыны прапускаў, часта наведваюць інтэрнаты. Дзякуючы сваёй высокай патрабавальнасці, пастаяннаму кантакту з групай дабіваюцца высокіх рэзультатаў у рабоце куратары дацэнт М. І. Данільковіч, асістэнт А. П. Новікаў.

Паспяхова працуе камсамольская арганізацыя кафедры, вялікую дапамогу якой аказваюць студэнты-камуністы С. Макавецкі, Л. Дзмітрыева, А. Калакуцкі. У полі зроку комсамольцаў — вучоба студэнтаў, работа навуковага гуртка, шэфская работа і работа ў інтэрнаце, працоўны семестр. Высокіх рэзультатаў дабіўся кафедральны СБА імя Альбараса, які ўзначальваў А. Калакуцкі. Добра папрацаваў у верасні на ўборцы бульбы і сельгасатрад. Часта сустракаюцца з камсамольцамі нашы ветэраны-камуністы, удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны А. В. Шыбаева і М. І. Юзефовіч. Яны расказваюць аб гераічным мінулым краіны, аб сваіх баявых таварышах, вучаць моладзь добрасумленным адносінам да працы, вучобы.

Не застаецца без увагі партыйнай групы і навуковая работа. На сумесных пасяджэннях абмяркоўваюцца пытанні планавання навукова-даследчай работы, аснашчэння кафедр сучасным абсталяваннем і г. д. Так, на адным сходзе партгрупы ішла размова аб рабоце студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі. Былі прааналізаваны ўсе бакі яе дзейнасці, зроблены адпаведныя вывады на будучае. Не раз камуністамі абмяркоўваліся перспектывы развіцця Беларускага міжвузаўскага цэнтра абслугоўвання навуковых даследаванняў—навуковага структурнага падраздзялення універсітэта, створанага на базе кафедры.

Рэгулярна, два разы ў год, на сумесным пасяджэнні кафедры і партарганізацыі заслухоўваюцца справаздачы навуковых кіраўнікоў аспірантаў і адказных выканаўцаў гаспадарчых дагавораў.

На нашай кафедры кожны год абараняюцца кандыдацкія дысертацыі. Супрацоўнікі прымаюць актыўны ўдзел у рабоце розных міжнародных, усесаюзных і рэспубліканскіх канферэнцый, семінараў, сімпозіумаў, школ, з'яўляюцца аўтарамі дзесяткаў артыкулаў. Кафедра праводзіць шырокія даследаванні ў галіне радыяцыйнага матэрыялазнаўства і іённай імплантацыі.

Ёсць, зразумела, у нас і свае праблемы. Пакуль не на належным узроўні вядзецца навукова-даследчая работа студэнтаў. Шмат нявырашаных задач па агітацыйнай рабоце і прафарыентацыі школьнікаў. Але ўсе гэтыя пытанні ўжо стаяць на парадку дня, і мы іх вырашаем, выкарыстоўваючы вопыт ветэранаў, камуністаў партгрупы.

У. ПАНАРАДАЎ,
партгрупорг кафедры фізікі цвёрдага цела.

ДА 40-ГОДДЗЯ ВЫЗВАЛЕННЯ БЕЛАРУСІ

Два з лішнім цяжкія гады знаходзілася беларуская зямля пад прыгнётам нямецка-фашысцкіх акупантаў, чакала вызвалення ад варожай навалы. І вось восенню 1943 года пачалося доўгачаканае наступленне Чырвонай Арміі. Савецкія войскі ўсё бліжэй і бліжэй падыходзілі да Беларусі, несучы ёй вызваленне.

КАБ ЗЯМЛЯ БЫЛА СВАБОДНАЙ

Перамога Чырвонай Арміі пад Курскам дала магчымасць разгарнуць наступальныя баі на цэнтральным участку савецка-германскага фронта.

Войскі Бранскага і Усходняга франтоў ужо 24 верасня ўступілі на тэрыторыю Беларусі. У 10 гадзін раніцы танкістамі 108-й стралковай дывізіі было вызвалена сяло М. Ліпаўка, а 26 верасня — першы горад — раённы цэнтр Магілёўскай вобласці Хоцімск.

Воіны-беларусы звярнуліся да ўсяго беларускага народа з заклікам узмацніць барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, пачаць вызваленне сваёй рэспублікі: «Наперад, у рашаючую бітву, таварышы!»

28 верасня былі вызвалены яшчэ два раённыя цэнтры — Клімавічы і Касцюковічы, а 30 верасня—горад Крычаў. У вызначаны Стаўкай Вярхоўнага Галоўнакамандавання тэрмін войскі Бранскага фронту выйшлі на бераг Сожа, фарсіравалі раку і захапілі плацдарм на правым беразе, стварыўшы тым самым спрыяльныя ўмовы для наступлення на Гомельскім напрамку.

Уступленне Чырвонай Арміі на тэрыторыю Беларусі з'явілася важнай ваенна-палітычнай падзеяй. Рэспубліка адна з першых прыняла ўдар нямецка-фашысцкіх войск у 1941 годзе. Гітлераўцы спалілі сотні гарадоў і вёсак, ператварылі ў руіны 7 тысяч школ, знішчылі больш за 2200 тысяч мірных жыхароў і ваеннапалонных. Але які б цяжкі не быў яе лёс, Беларусь не схіліла галаву перад ворагам, не стаў на калені беларускі народ. Войскам Чырвонай Арміі дапамагала мірнае насельніцтва, партыйнае падполле і антыфашысцкія арганізацыі, партызаны.

У пачатку кастрычніка перад савецкімі войскамі стаяла задача разгарнуць наступленне з мэтай поўнага вызвалення Беларусі.

Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандавання распрацавала дэталёвы план разгрому ворага на ўсім цэнтральным участку савецка-германскага фронта, ад Віцебска да Гомеля. Сіламі трох франтоў планавалася адначасова нанесці ўдары па флангах групы арміі «Цэнтр» на Віцебскім і Гомельска-Бабруйскім напрамках і ў цэнтры, на Аршанскім і Магілёўскім напрамках.

Вораг імкнуўся любой цаной затрымаць наступленне нашых войск. Нямецкае камандаванне разумела, што страта Беларусі можа прывесці да сур'ёзных ваенна-палітычных вынікаў для Германіі. Таму на найбольш верагодных напрамках наступлення савецкіх войск вораг стварыў асабліва моцную абарону, сканцэнтраваў вялікую колькасць танкаў і артылерыі.

На працягу кастрычніка-снежня 1943 года Чырвоная Армія разгарнула паспяховае наступленне. Быў вызвалены горад Невель, разгромлена варожая групіроўка ля Гарадка, што адкрыла нашым войскам шлях з поўначы на Віцебск, а таксама на Полацк — вялікі чыгуначны вузел, цераз які ажыццяўлялася забеспячэнне варожых войск.

Перад войскамі Чырвонай Арміі стаяла цяжкая задача: прарваць магутную абарону праціўніка на рубяжы Чырвонае — Горкі і далей па рацэ Проні, разграміць варожую групіроўку ў раёне Оршы і Магілёва, выйсці на Днепр і сакрушыць апошні абарончы рубеж, які прыкрываў шлях савецкім войскам у цэнтральныя раёны Беларусі.

У ходзе аперацыі ў верасні—кастрычніку 1943 года, а таксама пазнейшых дзеяннях у вясенне-зімні перыяд 1943—1944 гадоў былі створаны неабходныя ўмовы для канчатковага вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх войск.

...4 ліпеня беларускі народ букетамі кветак вітаў воінаў-вызваліцеляў, сустракаў іх хлебам-соллю. Нарэшце зямля Беларусі поўнасцю вызвалілася ад фашысцкай навалы, змагла свабодна дыхаць, а людзі пачалі мірную стваральную працу: патрэбна было з руін і попелу ўзнімаць гарады і вёскі, будаваць фабрыкі і заводы. Патрэбна было пачынаць усё спачатку.

Ж. ТАРАЙКОВІЧ,
студэнтка 5 курса гістарычнага факультэта.

СПОРТ

СПАБОРНІЦТВА НА ПРЫЗ ГАЗЕТЫ «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ»

Уладальнік прыза—ФПМ

У мінулую нядзелю стартавала XXXII спартакіяда універсітэта. Пачалася яна спаборніцтвам на прыз газеты «Беларускі універсітэт». Першакурснікі аспрэчвалі кубак па бегу. Па традыцыі дзяўчаты выступалі на дыстанцыі 500 метраў, а хлопцы — 1000. Больш за тысячу студэнтаў выйшлі на стадыён.

Звычайна на гэтых спаборніцтвах праводзіцца адкрыццё чарговай спартакіяды. Але, на жаль, цяпер яго не было з-за простай прычыны: сапсаваўся радыёвузел, і таму праводзіць урачыстасць стала немагчыма.

Тым не менш, спаборніцтвы удаліся бескампрамісная барацьбой. Прагнозы змяняліся, як у калейдаскопе, і тройку прызёраў ніхто не мог вызначыць да апошняга забегу.

На стадыёне акрамя галоўнага суддзі па лёгкай атлетыцы В. Зарэцкай самымі зацікаўленымі былі трэнеры зборнай В. Шпігаў і М. Жаўнерка. Пасля кожнага забегу яны размаўлялі з бегунамі, запрашалі іх у секцыю.

У мінулым годзе пяцісотметровую дыстанцыю выйграла Ала Трахаўцова, студэнтка хімічнага факультэта. Цяпер яна разам са сваёй сяброўкай па зборнай універсітэта студэнткай мехмата Аксанай Люцко назірала за спаборніцтвамі. Дарэчы, Аксана была другой на п'едэстале гонару мінулагодніх спаборніцтваў.

— Мала высокіх вынікаў, — сказала Ала. — Не тое, што ў мінулыя гады. Мяркую, рэкорды не будуць пабіты.

Ала мела рацыю. На рэкорды ніхто не пасягнуў.

Тры былыя ўладальнікі кубка — хімфак, гістфак і журфак — гарэлі жаданнем завяваць яго зноў. Але і астатнія факультэты не страчвалі надзеі.

Першую заяўку зрабілі студэнты факультэта радыёфізікі і электронікі. За некалькі тыдняў да стартаў старшыня спортбюро факультэта А. Кулінка сказаў:

— У нас добрыя бегуны. Вясной у кросе занялі першае месца. Цяпер на першым курсе многа тых, хто можа някепска прабегчы. Нам пад сілу змагацца за перамогу, але ж у кубку заўсёды займаем апошняе месца...

Радыёфізікі даказалі, што і яны могуць быць лідэрамі. Хлопцы, якіх тут большасць, да апошніх метраў не скідалі хуткасць. Гэта выглядала вельмі кантрасна, асабліва на фоне выступлення біяфака, дзе ў юнакоў лепшы рэзультат быў каля 3 мінут 20 секунд.

Радыёфізікі набралі 80, 11 балаў. У мінулым годзе такі вынік гарантаваў бы ім другое месца. Пасля фінішу радыёфізікі сабраліся разам і намеснік дэкана па фізвыхаванню і спорту В. Жукаў думаў ужо аб вясеннім кросе. Калі павіншавалі А. Кулінку і запрагназіравалі прызавое месца, дык ён нібы жартам, нібы ўсур'ёз адказаў: «Будзем першымі!» Цяжка перадаць, што рабілася са студэнтамі, калі яны даведаліся аб канчатковым выніку — толькі пятае месца. Але, ўсё па парадку...

Палавіна каманд ужо выступіла, аднак ніхто нават і не наблізіўся да лідэра. Намеснік дэкана па фізвыхаванню і спорту журфака Л. Артамонава настройвала сваіх падапечных на прызавое месца. Яна ведала, што курс не вельмі спартыўны, але ў прызёрах можа быць. І журналісты выступілі ўдала. Многія з іх палепшылі асабістыя рэзультаты, а сярэдні бал 80,44 вывеў іх у лідэры.

Факультэт прыкладной матэматыкі два гады запар фінішыруе другім. Яму крыху не хапала да перамогі. Сёлета матэматыкі настроіліся на барацьбу сур'ёзна і не пакінулі саперникам ніякіх надзей. Іх сярэдні вынік 85,55 бала з'яўляецца адным з лепшых за ўвесь час правядзення кубка.

Намеснік дэкана ФПМ па фізвыхаванню і спорту А. Міхнавец быў задаволены:

— У забегі мы, як правіла, ставім студэнтаў адной групы. Узнікае спаборніцтва паміж імі. Шчыра кажучы, такіх добрых вынікаў не чакаў. Тым больш прыемна.

Механіка - матэматычны і хімічны факультэты выступалі апошнімі. Яны ведалі рэзультаты ўсіх, і хоць асабістых высокіх вынікаў іх прадстаўнікі не паказалі, але прабеглі дружна — разрыў ад першага да апошняга быў невялікі, што дазволіла хімфаку заняць другое месца, а мехмату — трэцяе.

Расчараваннем стала шостае месца для студэнтаў юрыдычнага факультэта. Юрысты заяўлялі аб сваіх планах на перамогу. Але на бегавых дарожках не было відаць іх імкнення. Панавала апатыя, недапушчальная для лідэра універсітэцкага спорту.

У заключэнне прыводзім вынікавую табліцу (ачкі ідуць у залік спартакіяды):

1. **ФПМ — 180**
2. **Хімфак — 155**
3. **Мехмат — 130**
4. **Журфак — 110**
5. **Радыёфізікі і электронікі — 100**
6. **Юрфак — 90**
7. **Геафак — 80**
8. **Фізфак — 70**
9. **Філфак — 60**
10. **Гістфак — 50**
11. **Біяфак — 40**

У. АБРАМОВІЧ,
наш кар.

НА ЗДЫМКАХ: імгненні спаборніцтва на прыз газеты «Беларускі універсітэт».

Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

СПОРТ

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

29 кастрычніка 1983 г.

Зак. 1815. АТ 04508

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар

В. П. ВАРАБ'ЁЎ